С.В. Агароднікава, С.У. Кухта (Мінск, БДЭУ)

# АСАБЛІВАСЦІ СІНХРОННАГА І ДЫЯХРОННАГА СЛОВАЎТВАРЭННЯ

Слоўтварэнне — гэта працэс утварэння новых слоў ад ужо існуючых у мове. У сучаснай словаўтваральнай навуцы, як і наогул у мовазнаўстве, вылучаюцца два аспекты вывучэння словаўтварэння: сінхронны і дыяхронны. Адрозненні паміж гэтымі аспектамі заключаюцца ў тым, што дыяхроннае словаўтварэнне ставіць на мэце ўстанаўленне гістарычнай паслядоўнасці ўзнікнення новых слоў, вывучае шляхі ўзнікнення новых слоў, іх першапачатковую словаўтваральную структуру і яе змяненні ў працэсе гістарычнага развіцця. Сінхроннае ж словаўтварэнне разглядае жывыя словаўтваральныя сувязі паміж аднакарэннымі словамі з пункту гледжання сучаснага стану мовы, вывучае сістэму словаўтваральных сродкаў, якія функцыянуюць на дадзеным этапе развіцця мовы. Для сінхроннага словаўтварэння важна ўстанавіць сэнсавыя адносіны паміж аднагарэннымі словамі ў сучасны перыяд. Менавіта на падставе гэтых жывых сувязей і вызначаецца словаўтваральная структура вытворнага слова, устанаўліваецца яго ўтвараючая аснова і словаўтваральны фармант. Гістарычная паслядоўнасць утварэння слоў, іх першапачатковая словаўтваральная структура з'яўляюцца прадметам дыяхроннага словаўтварэння і для сінхроннага словаўтварэння не істотны. Таму тлумачэнне словаўтваральнай структуры аднаго і таго ж слова з сінхроннага і дыяхроннага пунктаў гледжання могуць не супадаць. Прыкладам гэтага можа служыць сінхронная і дыяхронная інтэрпрэтацыі словаўтваральнай структуры слоў *даярка* і *даяр* у беларускай мове. Гістарычна лексема *даярка* ўтварылася ад дзеяслова *даіць* з дапамогай суфікса -*арк*-(а): *даіць — дај-арк*(*а*). Назоўнік *даяр* з'явіўся ў мове значна пазней, калі даенне перастала быць толькі жаночай прафесіяй. Слова *даяр* утварылася ад назоўніка *даярка* шляхам адсячэння часткі -*ка*. Аднак з пункту гледжання сучасных (сінхронных) словаўтваральных сувязей гэтыя словы маюць іншую словаўтваральную структуру і ў іх складзе вылучаюцца іншыя словаўтваральныя элементы: *даіць→да-яр→даяр-к*(*а*). Параўн.: *сакратар →сакратар-к*(*а*), *студэнт→студэнт-к*(*а*) і інш. У слове *даярка* адбылося, такім чынам, перараскладанне і ўскладненне марфемнай структуры. Гістарычна яно складалася з корня *дај*-, суфіксаў -*ар*- і -*к*-, канчатка -*а*. Змянілася і ўтвараючая аснова назоўніка *даярка*. Гістарычна слова ўтварылася ад дзеяслова *даіць*. З пункту гледжання сінхраніі ўтваральнай асновай для слова *даярка* паслужыла слова *даяр*.

Адрозніваюцца дыяхронная і сінхронная інтэрпрэтацыя словаўтваральнай структуры ў слове *сталіца*. Гістарычна гэта слова ўтварана ад назоўніка *стол*: *стол→стал-іц(а)* («стольны горад»). З сінхроннага пунтку гледжання назоўнік сталіца з'яўляецца нематываваным словам. У сучаснай беларускай мове невытворнымі з'яўляюцца словы *дастойн*(ы), *дзяржав*(а), *доблесць, верасень, сталяр*. Гістарычна ўсе гэтыя словы маюць вытворную

аснову. Утвораны ад іншых слоў, сувязі з якімі ў сучаснай беларускай мове страчаны: *да-стой-н-ы, дзярж-ав-а, добл-есць, верас-ень, стал-яр*.

Назоўнік *горад* гістарычна звязаны з дзеясловам *гарадзіць*, ад якога калісьці быў утвораны. Але ў сучаснай беларускай мове сувязі паміж *горад* і *гарадзіць* страчаны, і слова *горад* трэба разглядаць як невытворнае.

Большасць слоў у беларускай мове могуць выступаць у сказе ці словазлучэнні ў розных граматычных формах, г. зн. змяняюцца па склонах, родах, асобах. Такія словы падзяляюцца на дзве часткі: аснову слова і канчатак.

Канчаткі служаць паказчыкамі граматычных формаў слова, што неабходна для сувязі слоў у словазлучэнні ці сказе. Аснова ж выражае лексічнае значэнне слова, напрыклад: *вад-а, вад-ы, вад-ой, вадз-е; чалавек-□, чалавек-а, чалавек-у, чалавек-ам; піш-ам, пуш-уць, добр-ы, добр-ага, добр-аму, добр-ым*.

Канчатак, такім чынам, з’яўляецца зменнай часткай слова. Частка слова без канчатка і ёсць аснова слова. У невытворных словах аснова далей не падзяляецца на значымыя часткі (марфемы) і з’яўляецца па сутнасці чыстым коранем: *рак-а, галав-а, лес, дарог-а, ноч*. Асновы вытворных слоў падзяляюцца далей на ўтвараючую аснову (г.зн. аснову, ад якой утварылася гэта слова) і словаўтваральную марфему (суфікс, прыстаўку і пад., з дапамогай якіх утвараецца новае слова). Напрыклад*: вод-н(ы), жалез-н(ы), піс-анн(е), пера-ехаць, раз-біць*. У залежнасці ад словаўтваральнай гісторыі слова ў склад яго асновы могуць уваходзіць, акрамя кораня, некалькі суфіксаў ці прыставак, якія, паслядоўна далучаючыся да папярэдніх асноў, утварылі новыя словы: *капаць→пера-капаць→перакоп-ва-ць→перакопва-нн(е); сін(і)→сін-е(ць →па-сінець→ пасіне-л(ы)* і інш.

Такім чынам, аснова вытворнага слова мае ў сваім саставе ўтвараючую аснову і словаўтваральную марфему. Утвараючую аснову яшчэ інакш называюць матывуючай асновай або словаўтваральнай базай, а словаўтваральную марфему (афікс) — словаўтваральным фармантам.

У сістэме сінхроннага словаўтварэння часам сустракаюцца выпадкі, калі вытворнае слова можа быць суаднесена не з адной, а з дзвюма і нават больш утваральнымі асновамі. Гэта значыць, што такія словы маюць не адну, а дзве і больш словаўтваральныя структуры. Напрыклад, дзеяслоў *вымывацца* можа разглядацца як утвораны ад вымыцца з дапамогай суфікса -*ва- (вымыцца — вымыва-цца)* і ад *вымываць* з дапамогай постфікса -*ца* (*вымываць — вымывац-ца*). Параўн. яшчэ: *дапасавацца — дапа-соў-ва-цца і дапасоўваць — дапасоўвац-ц*а.

У такіх выпадках, калі адно вытворнае слова можа разглядацца як утворанае ад дзвюх утвараючых асноў, прынята гаварыць аб множнасці матывацыі. Вывучэнне гэтай з’явы важна ўжо таму, што дае магчымасць больш поўна ўявіць узаемаадносіны паміж аднакарэннымі словамі ў сучаснай сістэме беларускага словаўтварэння, а таксама мае значэнне пры высвятленні словаўтваральнай структуры асобных слоў. Гэта акаклічнасць павінна ўлічвацца пры ўстанаўленні словаўтваральный структуры вытворных слоў.

У сінхроннай сістэме беларускага словаўтварэння двайную інтэрпрэтацыю словаўтваральнай структуры, г.зн. множнасць матывацыі могуць мець цэлыя групы вытворных слоў: *ваенны→да-ваенны і да вайны→да-ваен-н(ы); праверыць→правер-к(а) і правяраць→правер-к(а); беднаваты→беднават-а і бедна→бедн-луват-а*.

Такім чынам, веданне асноўных заканамернасцей беларускага словаўтварэння, у прыватнасці тых асаблівасцей, што могуць выклікаць пэўныя цяжкасці, важна перш за ўсё таму, што дазваляе правільна зразумець сэнсавыя адносіны паміж словамі, дазваляе глыбей пранікнуць ва ўнутраную форму вытворнага слова і г. д. Усё гэта, безумоўна, садзейнічае больш паспяховаму авалоданню лексічным багаццем беларускай мовы і правільнаму словаўжыванню пры маўленні на беларускай мове.